УДК 821.161.3 К. Чорны

# ТЭМА ЗЯМЛІ Ў РАМАНЕ К. ЧОРНАГА «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

**С. А. Розава,**
*саіскальнік кафедры рускай і замежнай літаратуры БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 12.04.17.

UDC 821.161.3 К. Чорны

# THEME OF EARTH IN THE NOVEL BY K. CHORNY «FATHERLAND»

**S. Rozava,**
*applicant at tue Department of russian and foreign literature of BSPU*

Received on 12.04.17.

У артыкуле даследуецца спецыфіка філасофска-творчай інтэрпрэтацыі К. Чорным традыцыйна беларускай тэмы зямлі ў рамане «Бацькаўшчына», аналізуюцца індывідуальна-аўтарскія асаблівасці мастацкага ўвасаблення зямлі як асноваўтваральнай ідэі нацыянальна-гістарычнага самавызначэння беларусаў.

*Ключавыя словы:* зямля, Бацькаўшчына, нацыянальны характар, нацыянальны вобраз, гістарычны час, гістарычнае вызначэнне, нацыянальнае вызначэнне.

The article considers the specific peculiarities of Kuzma Chorny's artistic and philosophical interpretation of traditional Belarusian theme of native land in his novel «Homeland». The authentic singularities of author's style discovering the concept of native land as the spiritual base of national-historic self-identification of Belarusian nation are analyzed in the article as well.

*Keywords:* native land, Homeland, national character, national image, historical time, historic self-identification of Belarusians, national self- identification of Belarusians.

Тэма зямлі, традыцыйная для беларускай літаратуры першай паловы XX ст., стала вызначальнай і ў многіх эпічных творах К. Чорнага – вядомага беларускага празаіка, драматурга, перакладчыка.

Гуманістычная скіраванасць творчасці К. Чорнага, сацыяльная і гістарычная канкрэтыка мастацкага адлюстравання пісьменнікам рэчаіснасці прыцягвалі ўвагу многіх літаратуразнаўцаў: А. Адамовіча, М. Мушынскага, В. Жураўлёва, М. Лужаніна, М. Стральцова, М. Тычыны, І. Саверчанкі і інш.

Вядомы беларускі паэт, драматург, перакладчык і крытык В. Вітка заўважаў: «Чорны прыйшоў у беларускую літаратуру са сваёй уласнай тэмай, сутнасць якой не ў этнаграфіі, а ў творчай ідэі, уласцівай усім яго творам ад першага апавядання да апошняга рамана. Гістарычны лёс беларускага народа, яго цяжкае мінулае і яго будучыня, сцвярджэнне народа ў праве на сваю бацькаўшчыну, на сваю нацыянальную годнасць – вось тэма, якая праходзіць праз усю творчасць пісьменніка»[1]. Пагаджаючыся з думкаю В. Віткі, варта адзначыць, што тэма К. Чорнага ў літаратуры – гэта, ў першую чаргу, тэма чалавека ў шматлікіх дапасаваннях – чалавек і час, чалавек і свет, чалавек і яго шлях да сябе.

У літаратурна-крытычным артыкуле «Свет у чалавеку» С. Андраюк адзначае шырыню мастацкага эпасу К. Чорнага: «Беларускі народ у выніку яго сацыяльнага і нацыянальнага разняволення дасягнуў такіх вышынь у сваім духоўным развіцці, што пачаў думаць ужо не толькі пра кавалак хлеба, уласную зямлю, але і адчуваць, усведамляць сваю прыналежнасць да чалавецтва, сваю самастойнасць і годнасць у сусвеце. Вось гэты духоўны ўзровень беларуса К. Чорны ў нашай літаратуры ўвасобіў асабліва глыбока» [1, с. 34].

Раман К. Чорнага «Бацькаўшчына» (1931) стаў адной з першых мастацкіх спроб філасофскага асэнсавання пісьменнікам драматычнага пошуку беларускім сялянствам свайго шляху «да зямлі і волі».

Галоўны герой рамана Леапольд Гушка – вобраз, запазычаны з жыцця. Мабыць, таму ён атрымаўся такім пранікнёным, шчымліва-балючым. У ім Чорны-гуманіст сканцэнтраваў увесь боль «зламанага» чалавека, спрадвечную крыўду беззямельнага селяніна.

У артыкуле «З думкай пра народ» у дачыненні да рамана «Бацькаўшчына» вядомы даследчык творчасці К. Чорнага М. Тычына піша: «Чорнаму хацелася паказаць, як пакутаваў чалавек, кладучы свае сілы на чужой зямлі, як карчаваў няўробленую дзялянку дзірваністага поля, колькі ў ім сілы духу і прагі жыць па-людску, як ён адразу акрыяў, ледзь адкрылася перад ім магчымасць стаць цвёрда на свае ногі і быць гаспадаром на зямлі. Хацелася пісьменніку паказаць і тое, як паступова пазбаўляўся яго герой ад многіх прымхлівых забабонаў, у якія ён працяглы час

[1] В. Вітка. Вялікі нацыянальны паэт / В. Вітка // Зб. «Кузьма Чорны». – Мінск, 1959.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верыў, як скідваў з сябе путы былых уяўленняў і марных спадзяванняў і як станавіўся свядомым удзельнікам вялікіх рэвалюцыйных падзей» [2, с. 8].

Леапольд Гушка – сімвал падманутай надзеі, няспраўджанай сялянскай мары набыць «берагі шчаслівай зямлі». Сын ткачапаўстанца з Сілезіі, які прыбіўся сюды, ратуючыся ад арышту і турмы, ён сам цяпер разам з жонкай, дачкой і двума сынамі вымушаны парабкаваць у панскім двары. Хаця *«гэта не быў ураджоны тутэйшы чалавек»*, але гэта быў *«чалавек самы просты»*, шчыры, з даверам да людзей і прагай працы ў крыві.

Сумуючы па «далёкай бацькаўшчыне», якую ён памятаў з расказаў бацькі, Леапольд Гушка шукае бацькаўшчыну на чужой зямлі. А бацькаўшчына гэтая набывалася цяжка: выгнаны з панскай хаты, ён спачатку жыў у хвойніку, пакуль не прыдбаў хату на знос. І з гэтага часу Леапольд Гушка жыве імкненнем набыць «дзве дзесяціны», каб «па-чалавечы пажыць», «ні на чыю ласку не апірацца».

Зямля была не толькі штодзённым клопатам Леапольда Гушкі, але і штодзённым жыццёвым выпрабаваннем. І разам з тым Зямля была верай у жыццё. Яна была самім жыццём: *«Вядома, хто спрадвеку мае сваю зямлю, дык таму лепш цяпер, абжыўся. А я пачынаю жыць з гэтага»* [2, с. 44].

Аднак балючая мара пазбавіцца парабкоўства, «што перадаецца ў спадчыну», абярнулася для Гушкі тым жа рабствам. Пазбавіўшыся парабкоўства панскага, ён трапляе ў рабства да Сурвілы – заможнага фальваркоўца-землеўласніка, які падманам і хітрасцю «ўсю вёску ў рукі ўгроб».

Жорстка пажартавала з Гушкам і «тутэйшае» падданства: дазволіла нарэшце набыць жаданыя дзве дзесяціны і забрала на вайну сына.

Свой горкі сялянскі лёс, нечалавечую працу *«да чарговага націрання крывавых мазалёў і да сёмага поту пад зрэбнаю сарочкаю»* Леапольд Гушка прымае з хрысціянскай пакорай. Але яго жыццёвая гісторыя, калі ён *«рваў камяні на неўрадлівай панскай камяніцы, а пасля сплачваў за яе ўсім жыццём сваім Сурвілу»*, паставіла пад сумненне спрадвечныя сялянскія маральныя імператывы – грэх і закон, і божы, і чалавечы: *«Няма ніякага граху! Мне дык грэх, а Сурвілу абармоціць усіх, дык не грэх! Закон? А што, гэты закон бог даў, ці проста яно пайшлося гэтак, як некаму зручней было?»* [2, с. 67].

Жыццёвыя акалічнасці прыводзяць Гушку да філасофскай высновы «ярмо жыцця», якая стала горкім пацвярджэннем яго жыццёвай практыкі.

Зямля спрадвеку была для беларуса жыццёвай асновай, яго зместам і ўнутранай сутнасцю. Жывая сувязь земляроба з зямлёй за некалькі стагоддзяў сфарміравала своеасаблівы зямельны інстынкт, які для селяніна-гаспадара, бадай што першачарговы ад інстынкту самазахавання, што не застаецца па-за мастацкай увагай К. Чорнага: *«Людзі з першай жа хвіліны пакіравалі свае думкі да переспелага жыта, адразу выйшлі жаць, забываючы сваю трывогу»* [2, с. 119]; *«адно лясы жылі незвычайным жыццём, паўнюткія сялянскага гора; адно жанкі, дый то найбольш старыя, сядзелі ціха ў хатах, чакаючы канца навалы і гаруючы – як гэта будзе пачаць жніво: жыта паспявала, на ўзгорках пад сонцам яно ўжо добра запалавела»* [2, с. 113].

К. Чорны перадаў адносіны селяніна да зямлі як да нечага не проста жывога, але таго, што мае душу, што здольна адчуваць радасць і боль разам з чалавекам: *«Што рабілася ў сэрцы гэтага чалавека?* (Паўла Няміры – *С. Р.*) *Можа, ён думаў пра тое, як некалькі дзён да гэтага, пазаўчора, ці што, развітаўшыся з тымі сваімі двума таварышамі, апынуўшыся ў лесе адзін, стаў раптам мяккі, як салома, быў блізкі да таго, каб цалаваць зямлю, што гэтак ціха драмала пад ляснымі імхамі, поўная цішыні, бязлюддзя,і гэта – пасля страшэннага грому вайны, пасля чакання смерці!»* [2, с. 64].

Працягваючы традыцыю адлюстравання «натуральнага» чалавека, закладзеную яшчэ літаратурай XIX ст. (Ю. І. Крашэўскі, Э. Ажэшка), К. Чорны малюе чалавека на зямлі як лагічны працяг прыроднага свету: *«Кучаравая галава амаль што ўсе дні на дварэ не ведала шапкі. Валасы абвяваліся водырным ветрам з хвойніку, сонца апякала і аратага, і зямлю»* [2, с. 43].

У шматлікіх лірычных апісаннях рамана чалавек зліваецца з зямлёй ў адзіным прыродным рытме: *«На полі корпаліся людзі, цешыліся з новых дзялянадчак зямлі, што натрапіліся ім пасля панскага продажу. Па іржышчы блыталася восеннае белае павуціннє, птушкі збіраліся ў вырай, сонца хадзіла нізка. Шарачак, зрэб'е, злямцованая кудзеля варушыліся разам з людзьмі на загонах, на межах»* [2, с. 44].

Малюнкі вясковага жыцця прасякнуты асаблівым лірызмам – характэрнай уласцівасцю ідэастылю К. Чорнага. Ствараючы паэтычныя карціны сялянскай працы, пісьменнік напаўняе іх сімпатыяй да чалавека зямлі, бязмежным спачуваннем яго незайздроснаму лёсу.

З асаблівай цеплынёй і павагай малюе К. Чорны Гушку-гаспадара: *«На восень зазябліў клін, каб да зімы ўпрэла ралля, а ў лагу, дзе апошні раз пан зжаў свой авёс,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*старанна зaараў іржышча. Ён цешыўся, што мае свайго каня, ён даглядаў яго лепш як сябе, клапаціўся пра яго больш, чым пра сваю хату і сям'ю»* [2, с. 43].

Сваёй паслядоўнасцю, грунтоўнасцю, сталай жыццёвай развагай Леапольд Гушка нагадвае коласаўскага Міхала з «Новай зямлі». Аднак у К. Чорнага вобраз селяніна істотна відазмяняецца, трансфармуючыся з селяніна-гаспадара ў селяніна-змагара і нараджаючы новы метавобраз – «ногі ў анучах і молат у руках». Такая мастацкая метамарфоза стала перш за ўсё вынікам глыбокай псіхалагічнай трансфармацыі гістарычнага вопыту працаўніка-пакутніка.

Акрамя падабенства ў мастацкім прынцыпе адлюстравання селяніна-гаспадара, відавочны і іншыя ідэйна-тэматычныя перасячэнні рамана з паэмай Я. Коласа «Новая зямля». Развіваючы коласаўскую ідэю «ўласнай зямлі», К. Чорны надае ёй філасофскае вымярэнне.

Міхал – галоўны герой паэмы «Новая зямля» – памірае, так і не *«разжыўшыся ўласнаю зямлёю»*. Леапольд Гушка набывае «дзве дзесяціны», але гэтая зямля застаецца для яго чужой: *»… на чужыне дзяцей пагадаваў і з гарабяды век не вылазіў. <…> Дзве дзесяціны цяпер маю…. Не хачу я, каб асядалі на гэтай нядолі мае дзеці!»*.

Аднак ці дастаткова набыць зямлю, не маючы Бацькаўшчыны? І што ёсць Бацькаўшчына? Ці толькі зямля, на якой ты нарадзіўся, якую пакінеш ў спадчыну нашчадкам? Ці гэта зямля, на якой ты гаспадар?

Бацькаўшчына Леапольда Гушкі – «бацькоўская горкая спадчына». Стары Гушка страціў Бацькаўшчыну ў змаганні за свае чалавечае правa. Сын набывае Бацькаўшчыну «праз гром і дым, агонь і кроў», і толькі на новай калгаснай гаспадарцы, на зямлі «агульнай» ўпершыню адчуў сябе гаспадаром. Гэты мастацкі парадокс – адна з асноўных сэнсаўтваральных дамінант ў філасофскім разважанні К. Чорнага.

Яшчэ адзін ідэйна-вобразны матыў рамана – «тутэйшасць», вызначэнне якой дзесяцігоддзем раней паспрабаваў даць Я. Купала.

Галоўную ролю рамана К. Чорны давярае «не ўраджонаму тутэйшаму» невыпадкова, пакідаючы адзінымі адзнакамі яго «нетутэйшасці» толькі вымаўленне і магерку з брылем. У астанім жа гэта – «непераможная ўпартасць», «цягавітая маўклівасць», тое нацыянальна-спецыфічнае, што склала, па вызначэнні Я. Купалы, «праўдзівы тып беларускі» [3, с. 466].

Зямля, на якой *«усе сілы свае паклаў, … ссівеў»*, асімілявала Гушку з «тутэйшымі»: *«Ты* (Павал Няміра – *С. Р.*) *тутэйшы, а я не тутэйшы. Мала што я ўжо гэтакі, як усе тут»* [2, с. 66].

Не менш трагічны ў рамане і вобраз старога Няміры, тутэйшага селяніна, які, прайшоўшы праз арышты і астрогі, страціўшы сям'ю, што засталася па той бок размежаванай вёскі, заканчвае свой жыццёвы шлях з працягненай рукою ля касцельнай брамы. Як і нетутэйшы Гушка, стары Няміра – ахвяра страшнага часу, калі сялянскую зямлю арандавалі нетутэйшыя, а тутэйшыя вымушаны былі парабкаваць на сваёй уласнай зямлі.

Дык што ёсць «тутэйшасць»? Ці толькі роднасць «па крыві», як лічылі прыхільнікі тэорыі прымардыялізму[1]? К. Чорны сцвярджае думку, што для беларускага этнасу «крывёю» была зямля. Мастацкім сведчаннем гэтаму стаў дыялог Гушкі з Сурвілам:

– *… Але праўда, што яму* (сыну Гушкі – *С. Р.*) *тутэйшчына! Па іх няхай сабе хоць немцы тут заўладаюць, яму ўсё адно. У ім жа чужацкая кроў: па бацьку, па табе гэта я кажу…*

– *Але! У мяне чужацкая кроў. Дык што ж! За парабка быць, дык тады абы-якая кроў добра, а калі ярмо з шыі скінуць, дык на гэта трэба мець тутэйшую кроў?!* [2, с. 92].

Вызначальныя для гістарычнага, нацыянальнага і чалавечага самасцвярджэння паняцці «Бацькаўшчыны», «тутэйшчыны» ў мастацка-філасофскай канцэпцыі К. Чорнага ўтвараюць складанае сэнсавае адзінства. Зямля – краевугольны камень гэтага адзінства, той ідэйны выток, з якога пачынаецца этнічная гісторыя беларусаў. Змяняюцца час і ўлада, змяняюцца формы сацыяльнага ўладкавання, зямля ж для селяніна застаецца нязменным «планам свету», яго спрадвечным анталагічным вызначэннем. Таму нязменным застаецца і патрабаванне народа «зямлі дайце!», якое стала лозунгам нацыянальнай барацьбы.

Зямельнае пытанне – нацыянальная характэрнасць шматпакутнай беларускай гісторыі. Паншчына, імперыялістычная вайна, белапольская акупацыя ніяк не змянілі «твар зямлі»: *«выраслі новыя фальваркі, а сялянскія загоны яшчэ больш падрабнелі; <…> парабкі цягнулі вужышча сваёй працы на панскім полі праз каторы ўжо век, праз доўгія вякі, ад бацькоў, дзядоў і далей у глыб цёмнага часу»* [2, с. 134]. Гэтай звыклай карцінай сялянскага існавання К. Чорны паставіў пытанне: для чаго была вайна: *«ці на тое гэта вайна гэтакая на галаву ўсяго народа ўссела была, каб народ і дагэтуль дурны астаўся? Што, гэта на тое рэвалюцыя была, ды і не адна, каб пан з войтам правілі сваё права?»* [2, с. 140].

[1] **Прымардыялізм,** ці **эссэнцыялізм** (ад лац. *primordial* – пачатковы), – ў этналогіі (этнаграфіі) адно з найбольш распаўсюджаных фундаментальных навуковых напрамкаў, якое разглядае этнас як пачатковую агульнасць людзей «па крыві» з нязменнымі прыкметамі, якая заяўляе аб сабе ў гісторыі і рэальным жыцці ў непаўторных канкрэтна-гістарычных формах [4; 5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ды і што гэта была за вайна? Вайна за зямлю? Але ў сялян замест зямлі была прымусовая праца на ей. Вайна за Бацькаўшчыну? Але ці была яна ў тых, хто за яе змагаўся?

Адказ на гэтыя пытанні К. Чорны шукае ў мастацкіх лёсах сваіх герояў: «палоннага салдата «варожай арміі» Эдварда Лявэра, які «сам падаўся ў палон», расчараваўшыся ў ідэалах змагання: *«Мне кажуць – ратаваць бацькаўшчыну. Дык няхай гэтакая бацькаўшчына праваліцца скрозь зямлю, калі я ў ёй павінен не жыць, а гніць!»* [2, с. 73], чалавека з пільні: / *Я сам не тутэйшы … <…> генералы і палкоўнікі, усе ўгаворвалі нас увесь час ваяваць за яе* (Бацькаўшчыну – *С. Р.*). *А якую я меў бацькаўшчыну з самых малых дзён сваіх? Што яна мне дала гэтая іхняя бацькаўшчына? У таго бацькаўшчына, у каго маёнтак, або хутар добры, або от гэтая пільня…»* [2, с. 138].

Спрадвечнаму сацыяльнаму канфлікту працаўнікоў і іх эксплуататараў, К. Чорны надае асаблівую вастрыню, уводзячы ідэйна-філасофскі змест рамана ў агульначалавечы кантэкст.

Адлюстроўваючы агульны гістарычны лёс працоўнага народа, для якога ўся Зямля – адзін вялікі арыштанцкі лагер, К. Чорны падкрэслівае ўмоўнасць палітычных і геаграфічных межаў. Не мае мяжы краіна «з скрываўленым целам»: *«Гэта быў малюнак таго дня па ўсёй Еўропе. Народы стаялі. Стаяў расійскі народ. Стаялі іншыя народы, з'яднаныя абцугамі пад сцягам Расійскай імперыі. Іх гналі заваяваць сабе старое права: з жабрачымі торбамі на плячах дагніць свой век у вялікай турме і перадаць гэтае права сваім дзецям»* [2, с. 54] .

І над гэтай агульначалавечай трагедыяй гучыць паўстанцкая песня ткачоў – сімвал яднання «бунтоўных нявольнікаў», сімвал яднання пакаленняў і народаў у барацьбе за сваё вызваленне.

У філасофскім роздуме «Аб зямлі»[1] Л. М. Талстой пісаў: «Земля есть общее и равное достояние всех людей, и поэтому не может быть предметом собственности отдельных лиц. Владение землею как собственностью есть одно из самых противоестественных преступлений. <…> Нельзя утверждать, что существующие права на землю были законны. <…> Насилие, обман, власть, хитрость – вот те источники, из которых исходят эти права. <…> Отнимите у народа деньги, товары, скот – и ваш грабеж закончится вместе с вашим уходом. Но отнимите у народа землю, и ваш грабеж будет продолжаться вечно. Он будет новым грабежом для каждого ряда сменяющихся поколений» [6, с. 166–167].

Раман «Бацькаўшчына» ёсць мастацкая ілюстрацыя спрадвечнай «зямельнай спекуляцыі» (Я. Купала). У жорсткім супрацьстаянні сыходзяцца на старонках рамана дзве праўды жыцця – цынічна-«высокая» філасофія Сурвілы: *«Тут, значыцца, справа гэтакая – на зямлі, перш за ўсё, трэба рабіць, пасля – яе трэба прыдбаць, калі свае няма, пасля, пане мой, трэба павіннасць несці за яе. Вайна – гэта і ёсць тая самая павіннасць за яе. Абараніць яе трэба»* [2, с. 74] і балючая крыўда Гушкі: *«Што, ён гэтую зямлю сам рабіў, сам стварыў яе, што прадае?! Бацькі яго ў народа гэтую зямлю адабралі, награбілі, а цяпер прадаюць?!»* [2, с. 34].

На ўсім працягу свайго мастацкага даследавання К. Чорны спрабуе асэнсаваць спрадвечную трагедыю сялянскага лёсу. Гістарычная наканаванасць ці вынік шматвяковай псіхалогіі эксплуататарства? Чаму вайна для сялян – «павіннасць за зямлю», а для іх прыгнятальнікаў – «заработак, прыбытак»?

Сумным лейтматывам праходзіць праз ідэйную канву рамана выразны жэст Паўла Няміры: «У пана – во, а ў мужыка – во»– своеасаблівы мастацка-аўтарскі каментарый К. Чорнага.

Тэма зямлі ў мастацкай інтэрпрэтацыі К. Чорнага – адна з праекцый глабальнай сусветналітаратурнай тэмы «Чалавек і час». Эпічнае палатно К. Чорнага адлюстравала шырокую карціну народнага жыцця – ад часоў, калі *«была скасавана паншчына і цар з панамі затыкалі мужычае горла»* да эпохі вялікага калгаснага будаўніцтва.

Раман «Бацькаўшчына» стаў мастацкай патрэбай ці нават неабходнасцю К. Чорнага асэнсаваць адвечнае імкненне беларуса «нацыяналізаваць» сябе, паказаць складаны гістарычны шлях беззямельнага сялянства, шлях ад пратэсту да барацьбы, ад «галетніцкае драбязы» і «натоўпу нейкага неарганізаванага зброду» да свайго чалавечага, гістарычнага і нацыянальнага «Я».

Прадмет мастацкай увагі К. Чорнага – чалавек зямлі ў яго жыццёвай экзістэнцыі, яго нацыянальна-гістарычны свет.

Жыццёвая драма Леапольда Гушкі ёсць мастацкая алегорыя спрадвечнай іроніі сялянскага лёсу. Падданства, якое чакае Гушка, – горка-іранічны мастацкі сімвал гістарычнай немагчымасці вольнага земляробства ва ўмовах існавання залежнага сялянства.

Індывідуальна-аўтарскае бачанне К. Чорнага выявіла глыбокую невырашальную супярэчнасць паміж чалавекам і гістарычным часам. Выкрываючы бесчалавечную сутнасць псіхалогіі землеўласніцтва – «зямельнага раб-

[1] З пісьма П. А. Сталыпіну 26 ліпеня 1907 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ства», як назваў яго Л. М. Талстой, яе разбуральную сілу, здольную знішчыць ўсё лепшае ў чалавеку, К. Чорны раскрыў складаную дыялектыку тонкай сялянскай натуры, па-мастацку дакладна перадаў боль зняважанай «народнай душы», даў (па вызначэнні самога К. Чорнага) «псіхалагічнае абгрунтаванне» нацыянальнага характару.

Лічачы, як і Л. М. Талстой, народ галоўнай сілай гісторыі, К. Чорны праз усё сваё творчае жыццё пранёс веру ў яго духоўную перамогу.

Зямлю як жывую надзённую ідэю, што адлюстравала гістарычную своеасаблівасць нацыянальнага існавання беларусаў, Чорны выводзіць на ўзровень нацыянальнай міфалагемы [7].

Зямля – першааснова, на якой фарміраваўся нацыянальны вобраз беларуса, той жыццятворчы пачатак, які нарадзіў «вялікую ідэю вызвалення» [3, с. 459].

Такім чынам, раман «Бацькаўшчына» – манумент чалавеку працы, чалавеку зямлі. Мастацкае ўзнаўленне пісьменнікам драматычнага жыцця беларускай вёскі ў час гістарычнага і сацыяльнага пералому ў спалучэнні з тонкім псіхалагізмам і глыбокай філасофскай рэфлексіяй далучае раман да лепшых узораў нацыянальнага эпасу.

*Літаратура*


1. *Андраюк, С.* Пісьменнікі. Кнігі: Літаратурна-крытычныя артыкулы / С. Андраюк – Мінск : Маст. літ., 1997. – С. 318.
2. *Чорны, К.* Бацькаўшчына : Раман, аповесці / К. Чорны. – Мінск : Юнацтва, 1989. – С. 348.
3. *Купала, Я.* Выбраныя творы / Я. Купала. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2002. – С. 638.
4. Новая философская энциклопедия: в 4 т. / Ин-т философии РАН; Нац. обществ.-научн. фонд / науч.-ред. совет: В. С. Стёпин, А. А. Гусейнов, Г. Ю. Семигин, А. П. Огурцов. – 2-е изд., испр. и допол. – М. : Мысль, 2010. — Т. 4.
5. *Бромлей, Ю. В.* Очерки теории этноса / Ю. В. Бромлей. – 2-е изд., доп. – М. : ЛКИ, 2008.
6. *Толстой, Л.* Письма 1907 г. / Л. Толстой // Полн. собр. соч. В 90 т. Гос. изд-во «Художественная литература», 1928-1958. – Т. 77. – М., 1956.
7. *Казакова, І. В.* Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем / І. В. Казакова. – Мінск : БОФФ, 1999. – С. 203.


*References*


1. *Andrayuk, S.* Pismenniki. Knigi: Litaraturna-krytychnyya artykuly / S. Andrayuk. Minsk : Mast. lit., 1997. – S. 318.
2. *Chorny, K.* Batskaushchyna : Raman, apovestsi / K. Chorny. – Minsk : Yunatstva, 1989. – S. 348.
3. *Kupala, Ya.* Vybranyya tvory / Ya. Kupala. – Minsk : Belaruski knigazbor, 2002. – S. 638.
4. Novaya filosofskaya entsiklopediya: v 4 t. / In-t filosofii RAN; Nats. obshchestv.-nauchn. fond / nauch.-red. sovet: V. S. Styopin, A. A. Guseynov, G. Yu. Semigin, A. P. Ogurtsov. – 2-ye izd., ispr. i dopol. – M. : Mysl, 2010. – T. 4.
5. *Bromley, Yu. V.* Ocherki teorii etnosa / Yu. V. Bromley. – 2-ye izd., dop. – M. : LKI, 2008.
6. *Tolstoy, L.* Pisma 1907 g. / L. Tolstoy // Poln. sobr. soch. V 90 t. Gos. izd-vo "Khudozhestvennaya literatura", 1928-1958. – T. 77. – M., 1956.
7. *Kazakova, I. V.* Simvolika i semantyka slavyanskikh mifalagem / I. V. Kazakova. – Minsk : BOFF, 1999. – S. 203.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ